**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

А1. Адзначце словы (спалучэнні слоў), вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:
1) касцёл;
2) перадрукоўваць;
3) дрозд;
4) лодка;
5) ягады і грыбы.

А2. Адзначце пары слоў, у якіх націск служыць для адрознення іх граматычнай формы:
1) мае – мае;
2) замкі – замкі;
3) травы – травы;
4) склікаць – склікаць;
5) палкі – палкі.

А3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *а:*
1) п..ўналецце;
2) галант..рэя;
3) скр..гатаць;
4) ц..наўтварэнне;
5) тр..скатня.

А4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *е*:
1) св..ткаванне;
2) вым..цены;
3) верац..но;
4) Верхн..дзвінск;
5) аб..ліск.

А5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **й**:
1) вы..грыш;
2) за..менны;
3) пады..граць;
4) пра..нфармаваць;
5) на..мальнік.

А6. Адзначце прыклады, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *ў* (нескладовае):
1) позняй восенню. .. лістападзе;
2) кветкі .. лузе;
3) героі фільма "Чырвонае лісце" ..яўляюцца.
4) падпісана ..нія;
5) а..дыторыя;

А7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара **ь**:
1) кін..це;
2) прамен..чык;
3) іл..няны;
4) патрыятычнас..ць;
5) кон..скі.

А8. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:
1) маз..ю;
2) абяз..броіць;
3) калон..а;
4) маладосц..ю;
5) Жан..а.

А9. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца змена апошняга зычнага асновы:
1) задуха;
2) смык;
3) ~~перасцярога;~~
4) горад;
5) подзвіг.

А10. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:
1) хусцінка;
2) вобразны;
3) свераду;
4) прыезд;
5) прынёсшы.

A11. Адзначце словы, дзе на месцы пропускаў трэба уставіць літару **н**:

1) белакачан..ы;
2) канаплян..ы;
3) паслан..ец;
4) гадзін..ік;
5) маражон..ае.

A12. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, у якіх *не (ня)* са словамі пішацца асобна:

1) (не) гарачая, а халодная вада;
2) (не) загорнуты часопіс;
3) (не) атрыманы табою ліст;
4) (не) знаходзіць выйсця;
5) (не) доўгая гутарка.

A13. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:

1) (ясна) вокі;
2) прэм'ер (міністр);
3) (пясчана) сугліністы;
4) (высока) паэтычны;
5) (паў) інстытута.

A14. Адзначце словы, якія пішуцца разам:

1) павярнуць (у) лева;
2) праходзіць (міма) лётна;
3) чытаць (без) разбору;
4) пайсці (у) чатырох;
5) пасеяць не (у) пару.

A15. Адзначце сказы, у якіх ужываецца **ні**:

1) Н.. новы штрых, н.. новае адценне не здолеюць паглыбіць хараства карціны.
2) Як бы н.. старалася сталасць, а не сцерці ёй таго, што накрэсліла дзяцінства.
3) Дождж н.. тады ідзе, калі просяць, а тады, калі сена косяць.
4) Н.. мазаля на далоні.
5) Ніводнай птушцы чалавек н.. прысвяціў столькі легенд, паданняў, прыказак і прымавак, як буслу.

A16. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:

1) дваццаць пяты;
2) яснее небасхіл;
3) зжаць своечасова;
4) ганарыцца дачкою;
5) ажыў і зазвінеў.

A17. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) Восенню дрэвы, быццам зацвілі залацістымі кветкамі.
2) Голас Аленкі звінеў, як ручаёк.
3) Убранне кожнай птушцы прырода здолела пашыць, няхай на ўсё жыццё адзіны, ды гарнітур, як мае быць.
4) У зімовыя дні сядзіць дзяўчына за кудзеляй, як кветка, і вядзе нітку за ніткай.
5) Амаль кожны верш Янкі Купалы мы разглядаем, як дзённік-споведзь, па якім можна ўзнавіць шлях паэта.

A18. Адзначце сказы, у якіх адасобленыя члены сказа трэба выдзеліць коскамі:

1) Свой першы верш я чытала хвалюючыся.
2) Забыўшыся на снеданне мастак выносіў у сад эцюднік і пачынаў пісаць квецень.
3) *Паўпрок дарогі ляжала напалову струхлелае дрэва.*
4) Сосны далёкія і блізкія сосны сэрцу вы любыя з вёснаў да вёснаў.
5) Слёзы адкуль яны ўзяліся? нястрымна лінулі з вачэй.

A19. Адзначце сказы, у якіх пабочныя словы трэба выдзеліць коскамі:

1) Вялікія, румяныя, адно ў адно яблыкі былі аднак кіслыя.
2) Упускаем у сэрца зіму і на жаль не можам ужо без зімы.
3) Больш вольна адчуваў сябе Вадзім менавіта ў дарозе, асабліва сярод шырокага поля, калі добра думаць, марыць, успамінаць.
4) Птушкі здаецца вітаюцца са мной зранку.
5) Шмат відаць жаўрук павандраваў, шмат пабачаў, многа праляцеў.

A20. Адзначце сказы з простай мовай, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) Прыехаў, сынок? – спытала маці і мякка дадала: – Я цябе даўно чакаю».

2) «Вярніся, неслух!» – пачуў Міколка дзедаў загад, але і не падумаў спыніцца.
3) «Я не веру, Маргарыта Казіміраўна, – запярэчыў Усевалад, – каб чалавек з такой чулай і харошай душой, як у вас, быў помслівы і злаславы».
4) Заўсёды баішся пачуць у адказ – «Мне, прабачце, цяпер не да вас».
5) «Тут на цябе вельмі сур'ёзная скарга» – гаворыць Агурскі.

**A 21.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:
1) У ліхтары, падвешаным над ганкам, палала свечка, і агеньчык трымцеў яркай хусткай, якой, здавалася, хтосьці адчайна махае.
2) Быў бедным – спачувалі, стаў багатым – зайздросцяць, але ўсё тыя ж.
3) Дрэва жыве, пакуль яго сілкуюць карані, а народ жыве, пакуль ён памятае сваю гісторыю.
4) Вопытныя паляўнічыя сцвярджалі – ваўчыца нічога не ела з таго дня, як забралі яе ваўчанят.
5) Тады змаўкаюць птушыныя спевы, і сонца на момант згасае тады і падаюць зноўку пакутныя дрэвы, калі ў вёсцы маёй паміраюць дзяды.

**A22.** Адзначце назыўны сказ.
1) Чакайце мяне ў госці.
2) Учарашняга дня не вернеш.
3) Мудрая восеньская цішыня.
4) На балоце калісьці капалі торф.
5) Пахне летам.

**A23.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае слова з'яўляецца ***дзейнікам:***
1) *Чулы* не пройдзе міма, паспагадае, дапаможа.
2) Пасля спорнага дажджу *пожня* густа парасла маладой травой, а бліжэй да бярэзніку – зайчыкавай капустай.
3) *Вучыцца* – добрая справа.
4) Мір вам, *людзі, лясы* і *дубровы.*
5) З прыездам *Толіка* ў леснічоўцы як бы пасвятлела.

**A24.** Устаўце прапушчаныя літары. Пастаўце, дзе неабходна знакі прыпынку.

*Кожны народ павінен ведаць сваю гісторыю але не для таго каб яе паўтараць бо па..тарэнне гісторыі нават самай бліскучай азначае тое што народ гэты не мае у(ў)жо сваіх ід..алаў у(ў) будучым што ён бачыць іх толькі у(ў) мінулым. Хоць гісторыя па сва..м змесце заў(ў)сёды звернута у(ў) мінулае але яна даследуец(цц)а і вывучаец(цц)а у(ў) імя будучыні. Даўно у(ў)жо стала н..абвержнай ісцінай выснова што народ які не веда.. сваёй мінуўшчыны не варты і будучыні. Як чалавек што, страціўшы памяць становіц(цц)а зусім бе..дапаможным так і народ які забываец(цц)а на сваё мінулае, робіц(цц)а бе..дапаможным у(ў) гістарычным быц(цц)і.*

*Са свайго мінулага народ ч..рпае у(ў)ласныя прыклады таго што натхняе і таго што засцерагае ад паўтарэння ..робленых памылак.*

**A25.** Укажыце стыль і тып тэксту.